## УЛАДЗІМІР АРКАДЗЬЕВІЧ СОСНА



Споўнілася 60 гадоў з дня нараджэння кандыдата гістарычных навук, дацэнта кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў Уладзіміра Аркадзьевіча Сосны.

У.А. Сосна нарадзіўся 2 студзеня 1952 г. у вёсцы Галяшонкі Смаргонскага раёна Гродзенскай вобласці ў сям'і служачых. У 1973 г. закончыў гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Станаўленне маладога гісторыка адбывалася пад уплывам вядомых навукоўцаў Л.С. Абэцэдарскага, М.І. Ермаловіча, А.П. Ігнаценкі, І.І. Коўкеля, У.М. Міхнюка, М.С. Сташкевіча.

Потым У.А. Сосна працаваў настаўнікам Мядзельскай сярэдняй школы Мінскай вобласці. У 1974 г. ён становіцца старшым лабарантам кафедры гісторыі БССР БДУ. На працягу 1975–1979 гг. У.А. Сосна вучыўся ў аспірантуры ўніверсітэта. Яго навуковым кіраўніком быў прафесар А.П. Ігнаценка. У 1983 г. У.А. Сосна паспяхова абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Фарміраванне саслоўя дзяржаўных сялян у Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст.», а праз тры гады яму было прысвоена вучонае званне дацэнта.

Навуковыя поспехі спрыялі станоўчым зменам у кар'еры гісторыка. У 1983 г. Уладзімір Аркадзьевіч становіцца выкладчыкам, а пасля дацэнтам кафедры эканамічнай гісторыі Беларускага дзяржаўнага інстытута народнай гаспадаркі. З 1988 г. ён дацэнт кафедры гісторыі БССР БДУ. Потым У.А. Сосна займаў пасаду дацэнта кафедры гісторыі Беларусі, а з 1994 г. – кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў. У 2001–2005 гг. юбіляр узначальваў кафедру гісторыі і беларусазнаўства Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы.

Сфера навуковых інтарэсаў У.А. Сосны значная, але ён вядомы перш за ўсё як спецыяліст у вывучэнні сялянскага пытання і палітычнага жыцця на беларускіх землях у апошняй трэці XVIII – першай палове XIX ст. Уладзімір Аркадзьевіч з'яўляецца аўтарам звыш 200 навуковых і вучэбна-метадычных прац. У 2000 г. навуковец апублікаваў манаграфію «Фарміраванне саслоўнагрупавога складу сялянства Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст.», у якой раскрыў палітыку царскіх улад у адносінах да земляробчага насельніцтва Беларусі, прааналізаваў сацыяльна-прававы статус асноўных і спецыяльных катэгорый сялянства. Яго імя сярод аўтараў некалькіх калектыўных манаграфій гісторыкаў, складальнікаў падручнікаў і дапаможнікаў для вучняў старэйшых класаў і абітурыентаў.

На працягу амаль 40 гадоў Уладзімір Аркадзьевіч паспяхова займаецца навукова-педагагічнай дзейнасцю. Яго лекцыі і практычныя заняткі са студэнтамі вылучаюцца высокім узроўнем выкладання і навуковай дасканаласцю. Яны заўсёды праходзяць у атмасферы ўзаемапаразумення паміж выкладчыкам і аўдыторыяй. У.А. Сосна з'яўляецца аўтарам тыпавых і вучэбных праграм па айчыннай гісторыі для школ і ВНУ, спецыяльных курсаў для студэнтаў і магістрантаў: «Палітычнае жыццё беларускай вёскі ў апошняй трэці XVIII – першай палове XIX ст.», «Грамадска-палітычная барацьба і нацыянальнае пытанне на Беларусі (канец XVIII – першая палова XIX ст.)», «Спрэчныя пытанні Айчыннай гісторыі». Ён выконвае абавязкі куратара спецыялізацыі кафедры. Падапечныя паважаюць Уладзіміра Аркадзьевіча за яго шчырасць і ўважлівасць.

У.А. Сосна прымае актыўны ўдзел у падрыхтоўцы кадраў вышэйшай кваліфікацыі, сярод яго вучняў тры кандыдаты гістарычных навук. Уладзімір Аркадзьевіч перадае свае веды і вопыт выкладчыкам, а таксама настаўнікам – слухачам Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы, дзе чытае лекцыі па тэматыцы: «Гісторыка-культурная спадчына Беларусі», «Войны ў гістарычным лёсе беларускага народа», «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці», «Стан сучаснай беларускай гістарычнай навукі».

За шматгадовую плённую педагагічную працу і навуковыя дасягненні У.А. Сосна ўзнагароджаны Граматай (1994) і Ганаровай граматай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (2001), а ў 2011 г. – Нагрудным знакам «Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь».

У штодзённым жыцці У.А. Сосна добразычлівы і чулы чалавек, які заўсёды дапаможа, дасць трапную параду. Гэтыя якасці юбіляра выклікаюць павагу да яго як з боку выкладчыкаў, так і студэнтаў.

Калектыў гістарычнага факультэта і кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў, сябры і калегі жадаюць Уладзіміру Аркадзьевічу здароўя, шчасця, творчых поспехаў у навукова-педагагічнай дзейнасці.

***Ю.Л. Казакоў***,
кандыдат гістарычных навук,
дацэнт, загадчык кафедры гісторыі Беларусі
старажытнага часу і сярэдніх вякоў
***А.Р. Дзянісава***,
кандыдат гістарычных навук,
дацэнт кафедры гісторыі Беларусі
старажытнага часу і сярэдніх вякоў